# НОВАЕ Ў ПАШПАРТНАЙ СІСТЭМЕ

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ Камуністычнай партыі савецкі народ у 1932 годзе паспяхова завяршыў першую пяцігодку. У краіне з'явілася многа новабудоўляў, выраслі новыя прамысловыя цэнтры і буйныя гарады. Колькасць гарадскіх жыхароў хутка павялічылася. У сувязі з гэтым неабходна было лепш арганізаваць улік насельніцтва. Гэтаму і садзейнічала ўвядзенне адзінай пашпартнай сістэмы.

Упершыню адзіная пашпартная сістэма ў СССР была ўведзена 27 снежня 1932 года пастановай ЦВК і СНК СССР «Аб устанаўленні адзінай пашпартнай сістэмы па Савецкаму Саюзу і абавязковай прапісцы пашпартоў». У гэтай пастанове гаварылася: «Адзіная пашпартная сістэма ўводзіцца з мэтай лепшага ўліку насельніцтва гарадоў, рабочых пасёлкаў, новабудоўляў, разгрузкі гэтых населеных месц ад асоб, якія не звязаны з прамысловасцю, не заняты ў вытворчасці і работай ва ўстановах, не заняты грамадскай працай, а таксама з мэтай ачысткі гэтых населеных пунктаў ад хаваючыхся крымінальных, кулацкіх і іншых антыграмадскіх элементаў».

Пазней пашпартная сістэма выйшла далёка за рамкі, якія былі ёй вызначаны ў 1932 годзе. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны яна мела вялікае значэнне для выяўлення варожай разведкі, якая імкнулася пранікнуць у тыл нашай краіны. У пасляваенны перыяд пашпартная сістэма адыграла вялікую ролю для пошуку блізкіх і родзічаў, якія ў гады вайны страцілі сувязь.

Улік насельніцтва, праводзімы з дапамогай пашпартнай сістэмы, адыгрывае важную ролю ў планаванні народнай гаспадаркі. Зыходзячы з даных уліку, плануецца забеспячэнне населеных пунктаў прадуктамі харчавання, таварамі шырокага спажывання, будаўніцтва школ, бальніц, культурна-бытавых устаноў і жыллёвага фонду.

Выкананне ўсімі грамадзянамі «Палажэння аб пашпартах», якое зацверджана пастановай Савета Міністраў СССР у 1953 годзе, служыць інтарэсам нашай дзяржавы, інтарэсам усіх савецкіх грамадзян.

Адказнасць за арганізацыю работы па выдачы пашпартоў і кантроль за выкананнем «Палажэння аб пашпартах» ускладзены на органы ўнутраных спраў і выканкомы гарадскіх, пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў працоўных. «Палажэннем аб пашпартах» устаноўлена, што ўсе грамадзяне СССР ва ўзросце ад 16 гадоў, якія жывуць у гарадах, раённых цэнтрах і пасёлках гарадскога тыпу, а таксама па ўсёй тэрыторыі пагранічнай зоны СССР, абавязаны мець пашпарты і прапіску ў органах унутраных спраў.

Грамадзяне, якія жывуць у непашпартызаванай мясцовасці, не атрымліваюць пашпартоў у тым выпадку, калі яны выязджаюць з месца жыхарства на тэрмін менш за 30 сутак. Яны павінны атрымаць у сельскіх Саветах даведку, якая засведчае іх асобу і мэту выезду.

Грамадзяне, якія прыбылі на жыхарства з адной мясцовасці ў другую на тэрмін больш за трое сутак або змянілі жылплошчу ў межах аднаго і таго ж населенага пункта, а таксама тыя, хто атрымаў пашпарт або змяніў яго, павінны ў сутачны тэрмін здаць свае пашпарты ў органы ўнутраных спраў на прапіску.

З мэтай стварэння лепшых умоў для абслугоўвання грамадзян і паляпшэння кантролю за станам пашпартнага рэжыму, забеспячэння больш поўнага і якаснага ўліку перамяшчэння насельніцтва Міністэрства ўнутраных спраў СССР па ўзгадненню з іншымі міністэрствамі прыняло палажэнне аб пераходзе на картачную сістэму ўліку прапісваемых грамадзян. Існуючыя да гэтага дамавыя кнігі адмяняюцца, за выключэннем кніг у дамах, якія знаходзяцца на правах асабістай уласнасці. Гэта абумоўлена тым, што па аб'ёму яны вельмі вялікія, для карыстання няזручныя і ўтрымліваюць рад даведак, неабходнасць у якіх адпала.

У гарадах і раённых цэнтрах, у дамах мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных, дзяржаўных, кааператыўных, дамах грамадскіх арганізацый і інтэрнатах прапіска грамадзян ажыццяўляецца па картачках прапіскі «А» і пакватэрных картачках «Б».

Картачкі прапіскі формы «А» падаюцца:

— для афармлення прапіскі і выпіскі грамадзян у мясцовы орган унутраных спраў;

— для пастаноўкі на воінскі ўлік і зняцця з уліку салдат, матросаў, сержантаў і старшын запасу.

Пакватэрныя картачкі формы «Б» выкарыстоўваюцца:

— для праверкі пашпартнага рэжыму;

— для кантролю за своечасовым атрыманнем, абменам грамадзянамі пашпартоў, прадаўжэння тэрміну прапіскі або выездам грамадзян, якім у гэтым адмоўлена;

— для своечасовага ўнясення змен у фінансавыя асабістыя рахункі ў выпадках прапіскі і выпіскі грамадзян;

— для складання спісаў на асоб прызыўнога ўзросту, на дзяцей, якія дасягнулі школьнага ўзросту, выдачы даведак.

Картачкі формы «А» складаюцца на грамадзян, якія прыбылі на пастаяннае і часовае жыхарства, а таксама на дзяцей да 16-гадовага ўзросту, якія прыбылі без бацькоў (апекуноў).

Картачная сістэма, ўводзімая на працягу 1973—1976 гадоў, забяспечвае паўнату ўліку перамяшчэння насельніцтва, дае магчымасць хутка наводзіць неабходныя даведкі і паляпшаць кантроль за захаваннем пашпартнага рэжыму. Акрамя гэтага, яна стварае лепшыя ўмовы для абслугоўвання насельніцтва.

Для зручнасці насельніцтва пашпартны стол Жабінкаўскага раённага аддзела ўнутраных спраў працуе і ў суботнія дні з 9 да 14 гадзін.

**М. МАСЛОЎСКІ,**
**намеснік начальніка аддзела ўнутраных спраў райвыканкома.**